# «Заўсёды адчувала сябе побач з выбаршчыкамі»

**Валянціна БЕГЕБА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Пінскай выбарчай акрузе № 15:**

— Вядома, для дэпутата парламента самай галоўнай справай з'яўляецца работа над законамі, іншымі словамі заканатворчая дзейнасць. Толькі ў 2023 годзе можна гаварыць пра 16 пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў, у якіх я прыняла ўдзел, пра 57 законапраектаў, прынятых у першым чытанні, 58 — у другім, у адным чытанні — 49, у тым ліку па ратыфікацыі міжнародных дагавораў, пагадненняў — 47, у двух чытаннях прынятыя тры законапраекты. Але гэта калектыўная праца. З яе вынікамі можна падрабязна азнаёміцца на электронных рэсурсах парламента.



У Палаце прадстаўнікоў з'яўляюся намеснікам старшыні камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання, чарнобыльскай катастрофы. Давялося працаваць у складзе камісій, дэлегацый, рабочых груп. І ў гэтым кірунку зроблена нямала. Але зараз хачу сказаць пра іншае: увесь свой дэпутацкі тэрмін я адчувала цесную сувязь з акругай, з маімі выбаршчыкамі. Маю на ўвазе не толькі асабістыя прыёмы, прамыя лініі, пісьмовыя і вусныя звароты, якія даводзілася разглядаць. Хоць пералічанае таксама надзвычай важна. Кожны са зваротаў быў разгледжаны, іх аўтары атрымалі адказы, многае ўдалося вырашыць аператыўна.

На працягу склікання імкнулася заўсёды быць у курсе спраў сваёй акругі. Пры першай магчымасці ўдзельнічала ў рабоце сесій райсавета, у пасяджэннях райвыканкама. А яшчэ ішла ў навучальныя ўстановы, працоўныя калектывы, гаварыла з людзьмі. Вось, скажам, у нас, на Піншчыне, асабліва «баліць» тэма мінулай вайны. Страшныя падзеі адбываліся, калі гэты край аказаўся пад акупацыяй нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яны ўчынілі сапраўдны тэрор мірнага насельніцтва і генацыд біблейскіх маштабаў. Дастаткова сказаць, што на Піншчыне было забіта больш людзей, чым пражывала ў горадзе да вайны. Паводле найноўшых даследаванняў, у рэгіёне карнікамі знішчана каля 72 тысяч людзей розных нацыянальнасцяў, у тым ліку ваеннапалонных. Сёння гэтаму ваеннаму злачынству беларускай дзяржавай удзяляецца асаблівая ўвага. Наш агульны абавязак — не дазволіць сцерці памяць пра загінулых ды нявінна забітых і не дапусціць паўтору чорных старонак гісторыі мінулага. Лічыла сваёй святой справай удзельнічаць ва ўсіх памятных мерапрыемствах. А яшчэ надзвычай важнай была размова на пазначаную тэму з маладымі людзьмі ў розных аўдыторыях. Размаўляла і бачыла водгук у іх вачах, адчувала, што зерне трапляе на добрую глебу. Зноў і зноў прыходжу да высновы, што ў нас добрая моладзь, з ёю трэба гаварыць на роўных, не баяцца любых пытанняў, у тым ліку і вострых. І гэта абавязак дэпутата любога ўзроўню.

Абавязкова трэба бываць там, дзе жывуць выбаршчыкі, асабліва калі гаворка ідзе пра сельскую акругу. У мінулым годзе мне давялося займацца пытаннем гандлёвага абслугоўвання малых населеных пунктаў раёна. Яшчэ раней ад грамадзян паступалі звароты-скаргі на недастатковы асартымент аўтакрам, на тое, што не заўсёды дакладна вытрымліваўся графік прыезду. Не раз даводзілася ўзнімаць гэтыя пытанні на розных узроўнях. Добра, што сітуацыя памянялася. Калі мы выехалі з кіраўніцтвам гандлёвай арганізацыі ў вёскі мінулай вясной, то пачулі ад людзей словы падзякі. Ды і на свае вочы ўбачылі прыстойны асартымент магазінаў на колах. З вяскоўцамі гаварылі таксама пра розныя аспекты жыцця. Асабліва сёння хвалюе людзей медыцынскае абслугоўванне, добра, што ў гэтым пытанні вялікіх нараканняў не было. Амаль усе жыхары невялікіх вёсак гаварылі аб міры як самай галоўнай каштоўнасці цяперашняга часу.

Думаю, што для дэпутата надзвычай важна ведаць і адчуваць, чым жывуць выбаршчыкі ў акрузе.

**Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота сайта газеты «Пінскі веснік».**

# НА КАРЫСЦЬ ЛЮДЗЕЙ І МАЛОЙ РАДЗІМЫ

**На працягу 14 гадоў Ніна Антонаўна ПУЧЫНСКАЯ з'яўляецца старшынёй Браслаўскага раённага Савета дэпутатаў, прыкладна столькі яна сумесна са старшынямі сельсаветаў займаецца добраўпарадкаваннем населеных пунктаў раёна.**

На Браслаўшчыне дзевяць сельскіх Саветаў, на карце раёна каля 600 населеных пунктаў. Тэндэнцыя выміранне вёсак, як і ў іншых рэгіёнах краіны, прыйшла і сюды — амаль у трохстах пражываюць менш за пяць чалавек. Нягледзячы на тое, што Ніна Антонаўна актыўна займаецца добраўпарадкаваннем аграгарадкоў, маленькія аддаленыя вёскі таксама знаходзяцца ў полі яе зроку: пусціць грэйдар, падсыпаць дарогу да могілак, дапамагчы з ачысткай калодзежа. Тым больш што апошнім часам прыемна цешаць душу старшыні факты вяртання маладых сем'яў у бацькоўскія дамы.

Сёння ў большасці вёсак, дзе пражывае да дзесяці чалавек, фактычна не засталося сельскіх клубаў, дзе б вяскоўцы маглі бавіць час. А сабрацца ўсім разам, адзначыць святы народнага календара ці проста адпачыць хочацца. Таму на Браслаўшчыне прыдумалі добраўпарадкоўваць месцы грамадскага адпачынку з альтанкамі і лаўкамі, звычайна там, дзе жыхары чакаюць аўтакраму. Да кожнага такога мініпраекта падыходзяць рацыянальна: каб адным махам і хмызняк убраць, і камфортную пляцоўку стварыць. У вёсцы Дзірнічы таксама ўладкавалі такую, а наступным днём бабуля-актывістка там разбіла кветнік.

«Канешне, вялікую дапамогу нам аказваюць старэйшыны, без якіх паміж вяскоўцамі і органамі мясцовага самакіравання не было б такой эфектыўнай сувязі. У Вайнюнцах востра ўстала пытанне з вадой, выйшла са строю помпа. Дык вось старэйшына Святлана Ракель арганізавала людзей, разам сабралі сродкі і набылі новую. Цяпер вяскоўцы самі назіраюць за воданапорнай вежай», — расказвае Ніна Антонаўна.

Браслаўшчына неаднойчы становілася пераможцай абласнога конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў, Опсаўскі сельсавет таксама нядаўна стаў лідарам. Ахрэмавіцкі і Відзаўскі былі ў ліку пераможцаў рэспубліканскага конкурсу па добраўпарадкаванні. Але і само кіраўніцтва раёна пад рэалізацыю найбольш цікавых праектаў мясцовых актывістаў вылучае сродкі з бюджэту. Так, у 2024 годзе ў сельсаветы плануюць накіраваць больш за 400 тысяч рублёў.

У аграгарадку Опса, які знаходзіцца на прыгранічны з Літвой і Латвіяй, мясцовыя ўлады стварылі інфраструктуру не горш за краявіды райцэнтра. Акрамя інфармацыйных стэндаў, акуратных туй, падсветкі, якая ўражвае дальнабойшчыкаў, тут у вяскоўцаў ёсць свая славутасць — помнік паравозу. Гэты аб'ект, які з'яўляецца копіяй старадаўняга транспарту, што звязваў Беларусь і Літву, вырабілі майстры з Відзаўскага каледжа. Тут у 1939 годзе перастала працаваць вузкакалейка, пазней разнеслі рэйкі, застаўся толькі насып, на які і паставілі гістарычную каштоўнасць, побач з якой сёння размяшчаецца сажалка з лілеямі.



Паравоз у аграгарадку Опса.

У вёсцы Пагошча стварылі зону адпачынку для дарослых і дзяцей, праект выйграў грант Віцебскай асацыяцыі мясцовага самакіравання, дадалі і асабістыя сродкі. Адметнасцю работы ў сваім раёне Ніна Антонаўна называе тое, што на ініцыятыву адгукаюцца талакой і працуюць на агульны вынік. Вось і пры добраўпарадкаванні дзіцячага гарадка значную падтрымку аказаў мясцовы СВК «Маяк Браслаўскі». Цяпер амаль у 600 тутэйшых жыхароў суседняй вёскі ёсць свая каляровая прастора з горкамі, альтанкай, а яшчэ да пляцоўкі вядзе цудоўны драўляны мост.

«Калі людзі зацікаўлены ў тым, каб зрабіць свой куток лепшым, вёскі будуць жыць. А органы мясцовага самакіравання павінны ўмець чуць і адгукацца на прапановы насельніцтва. Знойдуцца сродкі, час і сілы — было б толькі жаданне!» — усміхаецца Ніна Пучынская.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# І гонар, і вялікая адказнасць

**Своечасовая дапамога, падстаўленае плячо, суменне, цярпенне, разуменне, неабыякавасць да людзей, да жыцця ў сваёй вёсцы, раёне, вобласці, краіны ў цэлым... Без гэтага не можа адбыцца дэпутат, пераканана жыхарка Светлагоршчыны Таццяна СТУКАЧ.**



Дырэктар Дуброўскай сярэдняй школы, дэпутат Светлагорскага райсавета Таццяна СТУКАЧ ушаноўвае вяскоўцаў падчас Дня вёскі ў Дуброве.

Таццяна Іванаўна — дэпутат Светлагорскага раённага Савета дэпутатаў.

У свой час была абрана дэпутатам у сваім сельсавеце, і вось ужо чатыры скліканні — у раённым Савеце дэпутатаў.

Па сваёй асноўнай дзейнасці народная абранніца — педагог. Таццяна Іванаўна ўсё сваё жыццё прысвяціла рабоце з вясковымі дзецьмі. Хутка 19 гадоў, як яна працуе на пасадзе дырэктара ясляў-сада — сярэдняй школы ў аграгарадку Дуброва. Выхоўваецца і вучыцца тут 118 дашкалят і школьнікаў. Гэта дзеці не толькі з Дубровы, але і з сямі суседніх вёсак.

Родны населены пункт Таццяны Іванаўны, дарэчы, — адзін з буйных у раёне. Тут жыве амаль 500 чалавек. На тэрыторыі — амбулаторыя, Дом культуры, бібліятэка. Аграгарадок — цэнтр буйной гаспадаркі «Дубрава-Агра», дзе працуе шмат мясцовых жыхароў.

— Асноўная праца і як дэпутата, і як кіраўніка ўстановы адукацыі — гэта ў тым ліку клопат пра сем'і, узаемадзеянне з усімі дзяржустановамі на вёсцы, кіраўніцтвам гаспадаркі. Разам выступаем з ініцыятывамі і прымаем непасрэдны ўдзел у іх ажыццяўленні. Працуем і вырашаем усе хвалюючыя пытанні. Не ўсё, безумоўна, удаецца хутка і станоўча вырашыць, але мы імкнёмся, не застаёмся раўнадушнымі да праблемных сітуацый, — адзначае Таццяна Стукач.

Дэпутат з радасцю зазначае, што цяпер у абласную праграму па добраўпарадкаванні дарог уключаны іх аграгарадок Дуброва. Якасць дарог — вельмі значнае для мясцовых жыхароў пытанне, якое, безумоўна, хвалюе людзей, і дэпутаты звяртаюць на гэта ўвагу. Раней з удзелам дэпутатаў у Дуброве вырашалі пытанне водазабеспячэння. Яно пакуль не вырашана на 100 %, але пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю станцыя абезжалезвання, і якасць вады палепшылася.

У Таццяны Стукач — багаты вопыт работы і ў складзе аглядальных камісій на тэрыторыі свайго сельсавета. Давялося ёй разбірацца і ў асабістых зваротах людзей, калі была патрэбна падтрымка, дапамога, у тым ліку сацыяльная, шматдзетным сем'ям, адзінокім пенсіянерам.

Таццяна Іванаўна згадвае, што за амаль 15 гадоў дзейнасці ў якасці дэпутата райсавета плён працы вялікі.

— Зроблена шмат, безумоўна, не толькі мной асабіста, але і пры падтрымцы многіх калег-дэпутатаў, нашых мясцовых жыхароў. Гэта і добраўпарадкаванне, развіццё сацыяльна значнай інфраструктуры, удзел ва ўсіх рэспубліканскіх, абласных, раённых акцыях, арганізацыя і правядзенне мноства мерапрыемстваў. Адзін з прыкладаў — штогод, вось ужо на працягу больш чым дзесяці гадоў, мы ў Дуброве арганізоўваем свята вёскі, — падзялілася дэпутат.

Менавіта Таццяна Іванаўна выступіла ініцыятарам правядзення такога надзвычай папулярнага мерапрыемства сярод сваіх землякоў.

— Свята вёскі адзначаем сапраўды масава. Прыязджаюць, збіраюцца і былыя, і сённяшнія жыхары аграгарадка. Далучаюцца і ўсе нашы сацыяльныя ўстановы: школа, амбулаторыя, Дом культуры, бібліятэка і калектыў нашай гаспадаркі. Ушаноўваем вяскоўцаў, якія паказваюць сябе ў працы, вылучаючы актыўнай грамадскай работай на карысць роднай вёскі. Штогод аб'яўляем шмат самых розных намінацый, узнагароджваем людзей. Ушаноўваем, у тым ліку, працоўныя дынастыі землякоў, якія працуюць на розных сферах, — шчыра дзякуе дэпутат вяскоўцам, што яны падтрымліваюць гэту традыцыю.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота газеты «Светлагорскія навіны».**